БЕШАНКОВІЦКІ РАЁННЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

АДДЗЕЛ ПА АДУКАЦЫІ

**ЗАГАД**

БЕШЕНКОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

ОТДЕЛ ПО ОБРАЗОВАНИЮ

**ПРИКАЗ**

11.09.2023 №

г.п.Бешанковічы
Віцебская вобласць

Аб правядзенні раённага этапу рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта ”Збяры Беларусь у сваім сэрцы”

У адпаведнасці з планам работы аддзела па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама на 2023 год, на аснаванні палажэння аб правядзенні раённага этапу рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычным праекта “Збяры Беларусь у сваім сэрцы” з мэтай фарміравання ў навучэнскай моладзі патрыятычных якасцей і паглыблення пачуцця любові да сваёй краіны праз далучэнне іх да пазнання гісторыі, культуры і прыроднай спадчыны роднага краю

ЗАГАДВАЮ:

1.Арганізаваць і правесці з 11 верасня па 20 кастрычніка раённы этап рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта “Збяры Беларусь у сваім сэрцы” (далей – конкурс).

2.Зацвердзіць Умовы правядзення (Дадатак 1) і журы конкурсу (Дадатак 2).

3.Дырэктару дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі» Ючковіч А.В. забяспечыць падрыхтоўку і правядзенне конкурсу.

4.Кіраўнікам устаноў адукацыі:

4.1.забяспечыць удзел навучэнцаў і педагогаў устаноў адукацыі ў конкурсе;

4.2.прызначыць адказных за падрыхтоўку ўдзельнікаў у конкурсе;

5.Кантроль за выкананнем загаду ўскласці на намесніка начальніка аддзела па адукацыі Карбоўскую А.Ц.

Начальнік аддзела М.В.Шыпуля

З загадам азнаёмлены: А.Ц.Карбоўская

____________

С.Я. Баранок

____________

А.А. Галавенка

____________

У.У. Гаськоў

____________

В.Л. Красакова

____________

А.А.Шыпуля

____________

Н.М. Апанасёнак

____________

А.В. Ючковіч

____________

Дадатак 1

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад начальніка
аддзела па адукацыі
Бешанковіцкага райвыканкама
11.09.2023 №

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні раённага этапу
рэспубліканскага грамадзянска-
патрыятычнага праекта «Збяры
Беларусь у сваім сэрцы»

1.АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Дадзенае палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага конкурсу творчых работ ’’Радзімы спадчына - мой гонар“ (далей - Конкурс).

1.2 Арганізатарамі Конкурсу з’яўляюцца: аддзел па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама, дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі “Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі”.

1.3 Конкурс праводзіцца з 11 верасня па 20 кастрычніка 2023 года.

2.МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1 Конкурс праводзіцца з мэтай фарміравання у навучэнскай моладзі патрыятычных якасцей і паглыблення пачуцця любові да сваёй краіны праз далучэнне іх да пазнання гісторыі, культуры і прыроднай спадчыны роднага краю.

2.2 Асноўнымі задачамі Конкурсу з’яўляюцца:

масавае ўключэнне навучэнцаў у культурна-пазнавальную дзейнасць, накіраваную на атрыманне ведаў аб гісторыка-культурных і прыродных адметнасцях Беларусі;

папулярызацыя гістарычнай, культурнай і прыроднай спадчыны малой радзімы;

выяўленне і падтрымка цікавасці навучэнцаў у галіне інфармацыйных тэхналогій, стварэнне ўмоў для раскрыцця іх творчых здольнасцей;

стварэнне іміджу рэгіёнаў як прывабнага турысцка-экскурсійнага і культурна-пазнавальнага аб’екта.

3.УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

Удзельнікамі Конкурсу з’яўляюцца навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (індывідуальна) ва ўзросце ад 14 гадоў.

4.ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца ў тры этапы:

першы этап — ва ўстановах адукацыі;

другі этап — раённы;

трэці этап — абласны;

чацвёрты этап — рэспубліканскі.

Рэспубліканскі этап конкурсу праводзіцца у 2 туры: тэарытычны і практычны.

4.1 На першым этапе конкурсу навучэнцы праводзяць краязнаўчае даследаванне з мэтай вызначэння адметнасцей свайго краю.

Па вынікам ствараецца брашура, у якой змешчаны матэрыял аб ”топ-5“ найбольш значных гістарычных, культурных і прыродных асаблівасцях раёна (па кожнай пазіцыі — 5, усяго — 15).

Брашура выконваецца у фармаце А4, pdf-файл і уключае: тытульны ліст, інфармацыю аб аб’ектах, карта-схему з адначанымі 15 адметнасцямі, спіс выкарыстаных крыніц. Інфармацыя аб аб’ектах павінна быць прадстаўлена лагічна ў адпаведнасці з наступнай структурай: месца знаходжанне аб’екта, гістарычная даведка, яго апісанне дапоўненае фотаздымкам. Пры выкарыстанні літаратуры неабходна даваць спасылкі ў тэксце (калі матэрыял аўтарскі, то гэта таксама неабходна адзначыць). Інфармацыя аб адным аб’екце павінна займаць не больш 2 старонак.

4.2 На другім этапе ацэньваюцца брашуры дасланыя ўстановамі адукацыі. Ад кожнага раёна вызначаецца 1 пераможца і прызёры. У трэцім этапе ўдзельнічае 1 пераможца раёнага этапу.

Крытэрыі ацэнкі брашуры:

лагічнасць і змястоўнасць прадстаўленай інфармацыі аб аб’екце;

крэатыўнасць афармлення;

самастойнасць у зборы і аналізе матэрыялу.

Брашуры дасылаюцца не пазней 20 кастрычніка 2023 г. на электронны адрас: cvr_beh@mail.ru і ў пячатным выглядзе па адрасу: г.п.Бешанковічы, вул. Валадарскага, 18 (экалагічны аддзел).

4.3 На трэцці этап (абласны) дасылаецца адна распрацаваная брашура пераможцы другога этапу (першае месца).

У вызначаны час у анлайн фармаце праводзіцца краязнаўчая віктарына, распрацаваная на падставе матэрыялаў брашур. Тэрміны і парадак правядзення віктарыны будуць паведамлены удзельнікам дадаткова.

Пераможцы і прызёры абласнога этапу рэспубліканскага турніру вызначаюцца па сумме месцаў за распрацаваныя брашуры і па выніках віктарыны.

4.4 Рэспубліканскі этап праводзіцца ў вочным фармаце у 2 туры: тэарытычны і практычны. Дата і месца правядзення заключнага этапу будзе даведзена да ведама ўдзельнікау дадаткова.

Для падрыхтоўкі каманд да ўдзелу ў рэспубліканскім этапе напярэдні (за 2 тыдні) на сайце рэспубліканскага цэнтра (https://rcek.by/) змяшчаюцца брашуры ўдзельнікаў дадзенага этапу.

4.4.1 Першы тур (тэарытычны) уключае заданні адкрытага і закрытага тыпу на веданне гісторыка-культурных і прыродных асаблівасцей Беларусі. Заданні будуць распрацаваны з улікам матэрыялу, прадстаўленага ў брашурах, а таксама змяшчаць сведкі аб агулянавядомых дастапомнасцях краіны.

Тэарэтычны тур складаецца з некалькіх частак:

”інтэлект-буквар“ (каманды адказваюць на пытанне, адказ на якое пачынаецца з літары згодна беларускага алфавіта);

”3х5“ (пытанні размеркаваны па трох тэматычных катэгорыях (гісторыя, культура, прырода), якія ўключаюць пяць living рознаўзроуневых пытанняў у кожнай катэгорыі).

4.4.2 У другім туры (практычны) каманда за пэўны час павінна скласці экскурсію-імправізацыю па аб’ектах, якія атрымалі па выніках жараб’ёўкі.

Крытэрыі ацэнкі практычнага тура:

лагічнасць пабудовы экскурсіі;

экскурсійная падача інфармацыі;

паўната і дасканаласць звестак аб аб’ектах;

адказы на пытанні.

4.4.3 Каманды — пераможцы і прызёры турніру вызначаюцца па выніках двух тураў.

4.5 Аўтары, удзельнікі конкурсу, даюць згоду арганізатарам на публікацыю сваіх работ, публічную дэманстрацыю і некамерцыйнае выкарыстанне матэрыялаў (з захаваннем аўтарскіх правоў) з мэтай папулярызацыі рэспубліканскага праекта.

## 5. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖВАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ І ПРЫЗЁРАЎ КОНКУРСУ

Сярод удзельнікаў раённага этапу конкурсу вызначаюцца пераможцы (1 месца) і прызёры (2, 3 месца), якія ўзнагароджваюцца дыпломамі аддзела па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама першай, другой і трэцяй ступеняў адпаведна.

Дадатак 2

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад начальніка
аддзела па адукацыі
Бешанковіцкага райвыканкама
11.09.2023 №

Журы конкурсу:

1.А.В.Ючковіч – дырэктар ДУА «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі»

2.Л.В.Гаралевіч – метадыст ДУ «Бешанковіцкі раённы вучэбна-метадычны кабінет»

3.В.В.Аўчыннікава – загадчык эстэтычнага адзела ДУА «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі»

4.Г.В.Бучмінская – метадыст ДУА «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі»

5.Леаненка С.П. – старшы навуковы супрацоўнік ДУ "Бешанковіцкі раённы гісторыка – краяведчы музей"